Установа
«Занальны дзяржаўны архіў у г.Навагрудку»



# *Любоў да Радзімы заўсёды святая…*

*да 110 –й гадавіны з дня нараджэння паэтэсы Ніны Міхайлаўны Тарас (1916-2006)*

*Будучая паэтэса нарадзілася 15 мая 1916 г. у вёсцы Заполле Навагрудскага павета (сучасны Навагрудскі раён Гродзенскай вобласці) у сялянскай сям'і Міхаіла Адамавіча і Антаніны Сямёнаўны Тарасаў. Тут жа, у роднай вёсцы Ніна атрымала пачатковую адукацыю, якую ў 1930 годзе прадоўжыла ў Навагрудскай беларускай гімназіі.*



ЗВЕДАЙ МОЙ КРАЙ

Хочаш край мой зведаць?
Зведай, калі ласка.
Што ні крок — легенда,
Што ні дзень — то казка.
Замеці таполяў,
Громаў перазвоны...
У бярозку ясень
Ад вясны ўлюбёны.
Патануў у ночы
Ціхі спеў дзявочы...
Ходзяць казкі полем,
Па разлогах крочаць.
Ходзяць казкі борам,
Ходзяць казкі гаем...
Ад шчаслівых мараў
Сэрца замірае.
Не пайду дадому,
Не скажу нікому,
Што і мне мой ясень
Любы пакрыёму.
Што блукае следам
І за мною казка...
Хочаш край мой зведаць?
Зведай, калі ласка.

*1971*

170




Ф. 213. Воп.1. Спр. 5.




*Любоў да зямлі, выхаваная ў сценах бацькоўскай хаты, да родных мясцін Ніна Тарас пранясе праз усё жыццё.*

*У 20-30-я гады мінулага стагоддзя Навагрудак з’яўляўся цэнтрам ваяводства ў складзе Другой Рэчы Паспалітай. Горад быў невялікім, але гістарычныя рэаліі моцна прысутнічалі ў свядомасці жыхароў. Дзейнасць беларускай гімназіі мела асабліва важнае значэнне для развіцця асветы і культуры як рэгіёна, так і ўсёй Заходняй Беларусі.*







*Гімназія была прыватнай і ўтрымлівалася за кошт бацькоўскага камітэта. Прага да ведаў у асяроддзі беларускага сялянства і жаданне, каб дзеці атрымалі адукацыю на роднай мове, спрыялі развіццю гімназіі. Вучні з захапленнем чыталі, перапісвалі, вучылі напамяць творы беларускіх аўтараў, якія ва ўмовах Заходняй Беларусі выхоўвалі пачуццё грамадзянскасці і патрыятызму, прывівалі густ да мастацкага слова.*



Навучэнкі гімназіі. Ніна Тарас у першым радзе першая злева. 1931-1932 навучальны год.

Дзяржаўны каталог Музейнага фонду – Дзяржаўны музей гісторы беларускай літаратуры



Будынак былой Навагрудскай беларускай гімназіі

У 1934 годзе дзейнасць гімназіі рашэннем польскіх улад была спынена, а навучэнцам прапанавана прадоўжыць навучанне ў польскай гімназіі імя А.Міцкевіча ў Навагрудку. Аднак большасць гімназістаў аддалі перавагу роднаму слову і пераехалі ў Вільню, каб навучацца ў Віленскай беларускай гімназіі. Сярод іх была і Ніна Тарас. Гэты перыяд жыцця быў насычаным і меў важнае значэнне для развіцця і стаўлення Ніны Тарас, як паэтэсы. Навучэнцы Віленскай беларускай гімназіі, як і Навагрудскай, выступалі супраць паланізацыі і за аб'яднанне тэрыторый Заходняй Беларусі з БССР.



ЯШЧЭ, ВЕРУ...

Яшчэ, веру, ты, вёска, устанеш,
Яшчэ, веру, прачнешся ад сну,
І пабачыш сваё ты світанне,
І спаткаць яшчэ выйдзеш вясну.

У палях захвалююцца нівы,
Сонца косы скупае у іх,
І пакоцяцца ўдаль пералівы
Ціхазвонных лугоў веснавых.

А па чорнага неба разорах,
У туманнай начной цемнаце,
Ўзыдзе ранні палаючы золак,
Залатою зарой зацвіце.

На усходзе заззяе зарніца,
Змые бляскам нядолі сляды.
Будзем воляю мы ганарыцца,
На ўвесь свет гімн спяём малады.

Забрыльянцяцца росы вясёлкай,
Як пачне Першамай расцвітаць.
Яшчэ, веру, прачнешся ты, вёска,
Яшчэ выйдзеш вясну сустракаць.

*1936*

8

У 1936 годзе Ніна Тарас закончыла гімназію. У гэты ж час яна пачынае друкаваць вершы.



МІХАСЬ ВАСІЛЁК.

**А час прыдзе.**

*Я. Коласу.*

Абцёр сталёвы плуг на павароце,
Сьцюдзёны вецер дзьме ў дзіравую сярмягу.
— Дазволь ты, шэрая зямліца - маці,
Я на тваіх грудзёх тут супачыць прылягу...

Пад твой выразны стогн пачну я песьню,
Пад шум глухі аеру ў гразкай смузе, —
Ня бойся, што зіма скуе цябе — зацісьне...
Вясной каліны чырваньню глянеш ярчэй у лузе

Не каюся, што я прышоў у сьвет паэтам...
Хачу глыбей адчуць нізоў працоўных гора,
Пакрыўджаных сагрэць яснейшых дзён прыветам,
на варце стаць дазорам!

Краіна родная — усьмех вясны расьцьвіўшай!
Прысягу склалі мы даўно перад табой!
Ў сям'і народаў і ты будзеш ня лішняй...
А час прыдзе, прыдзе, як майскі цьветабой!

Барозны шэрыя
Дадуць нам ураджай за ўбогія гады, —
І песьні сумныя над роднаю зямлёю,
Заменім песьняй радасьці дружынаў маладых!

Баброўня, XI 1936 г.

НІНА ТАРАС.

**На Новы Год.**

*Натальлі Арсеньневай.*

Заігралі, заігралі
Ветры звонам, пералівам,
А сьняжынкі танцавалі
Галасіста, аж-на дзіва.

Сьвечка ў хаце дагарае,
Рукі скрэплі ад марозу.
Не бядуй, маці старая,
Сёньня сорамна ліць сьлёзы.

Спатыкаем, знай, Год Новы
Не такі, як быў учора, —
Узаром загон дзірновы,
Ускалышам песьняй гора.

Сілы шмат ў руках я маю,
А дастану мо работу,
Узмахнуся — паканаю. .
Скажаш: жыць яшчэ ахвота.

За кусок з мякінай хлеба
Ласкі іх прасіць ня будзем.
Маці, плачам больш ня трэба
Надрываць старыя грудзі!

Вось паслухай: пералівам
Ветры долю напявалі,
А сьняжынкі, аж на дзіва...
Танцавалі, танцавалі.

Вільня, 1.1. 1937 г.

43

Верш "На Новы Год" у месячніку "Беларускі летапіс", №2-3, С.43.1937. Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва». Ф. 293. Воп. 1. Спр. 326. Арк. 8

*Устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі Ніна Тарас сустрэла ў г. Ліда, дзе з 1938 года пражывала з мужам. Яна пачала працу ў раённай газеце «Уперад». У рэдакцыі газеты працаваў таксама паэт Валянцін Таўлай, з якім склаліся прыязныя стасункі.*

*Гэта быў час актыўнай грамадскай дзейнасці – Ніна Тарас выбрана дэпутатам Лідскага гарадскога Савета, яе прынялі ў члены ВЛКСМ. З'яўляюцца новыя вершы, яна часта выступае перад выбаршчыкамі і чытачамі. Нарэшце, у 1940 годзе выйшаў першы зборнік паэтэсы «На ўсход ідучы…» і яна стала членам Саюза беларускіх пісьменнікаў.*



НА ЎСХОД ІДУЧЫ

Шумелі, шумелі бярозанькі ў гаю
Удзень і ўначы.
У іх я пра шчасце сваё запытаю,
Удаль ідучы.
Скажыце, ёсць многа дарог і сцяжынак
Між ніў і гаёў,—
Якою сягоння ісці я павінна
Па шчасце сваё?
Шумелі, шумелі бярозанькі ў гаі
Удзень і ўначы:
— Дарогу да шчасця ты знойдзеш у краі,
На ўсход ідучы.
Скажыце, ёсць песні, як сонная восень,
Як сум салаўя,
І ціха-журботныя песні калоссяў,—
Якую пяяць?
Не тую, што ціха шуміць на палетках
Тугою-журбой,—
Спявай, што у маршы спяваюць сусветным,
Выходзячы ў бой.
Шумелі, шумелі бярозанькі ў гаі
Да позняй начы...
Знайшла я і песню, і долю ў краі,
На ўсход ідучы.

*1940*

5



Смерць нямецкім акупантам!

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# УПЕРАД

ОРГАН ЛІДСКАГА ГАРКОМА І РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

15. Чацвер, 1 ліпеня 1943 г.

Партызаны-падрыўнікі! Узмацняйце ўдары па варожых камунікацыях, не прапускайце к фронту варожыя эшалоны!

## К оружию, товарищи!

## З франтоў Айчыннай вайны

(З паведамлення Совінформбюро)

## Пісьмо асабістага састава дывізіі імя Тадэуша Касцюшкі Маршалу Савецкага Саюза, Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны І. В. Сталіну



УПЕРАД № 15

# ПАРТЫЗАНЫ І ПАРТЫЗАНКІ! З КОЖНЫМ ДНЕМ УЗМАЦНЯЙЦЕ УДАРЫ ПА НЯМЕЦКІХ АКУПАНТАХ!

НЕ ДАДЗІМ ЖЫЦЦЯ НЕМЦАМ НА НАШАЙ ЗЯМЛІ!

## НЯМА ХОДУ ФАШЫСЦКІМ ЦЯГНІКАМ

Партызан І. В.

## Налёт на станцыю Б.

## Знішчылі абход

## МЁРТВЫ ГОРАД

Г. К.

## Дзеянні авіяцыі саюзнікаў

## Замежная хроніка

Рэдакцыя

Газета «Уперад», орган Лідскага падпольнага гаркама-райкама КП(б)Б, № 15, 01.07.1943.
Сайт УК «Лідскі гісторыка-мастацкі музей»

*У гады Вялікай Айчыннай вайны Ніна Тарас была сувязной спецгрупы партызанскай брыгады імя Кірава і партызанскага атрада імя Катоўскага брыгады імя Дзяржынскага, што дзейнічалі на Навагрудчыне. Хата Ніны Міхайлаўны выкарыстоўвалася для явак партызан. Праз некаторы час хата згарэла, загінулі і ўсе рукапісы, памятныя кнігі і іншыя каштоўныя матэрыялы.*



НЕ ПЛАЧ

Не плач, мая гаротная,
Што на сваіх палях
За сцежкай паваротнаю
Наш абарваўся шлях.
Будынкі нашы спалены,
Ўзарваныя масты,
І цяжка мы паранены,
І сіл не маеш ты.
А сцежка за аселіцай
Жытамі ўдаль ідзе.
Куды ж яна пасцелецца,
Куды нас павядзе?
Ды будзем хоць бы тыднямі
Ісці праз ночы-дні,
Пакуль шляхі блакітныя
Туман не засланіў;
Пакуль зара праменіцца,
Хоць падаем ад ран,
Пакуль нам не сустрэнецца
Брыгада партызан;
Пакуль як трэба ворагу
Адпомсцім мы з табой
За край, агнём зруйнованы,
За боль — і твой і мой.

*1943*



Слоў няма, каб цяпер гаварыць,—
Яны анямелі.
Слёз няма, каб наўзрыд праліць,—
Яны скамянелі.

На руінах стаю адна
У суровым маўчанні.
А навокал — вайна, вайна,
Папялішчы ды камні.

Я спытала паўшых байцоў:
— Што рабіць мне, скажыце, героі?
І, здаецца, шапнулі слаўцо:
«Да зброі! Да зброі!»

*1942*

*За падпольную дзейнасць і натхнёнае паэтычнае слова паэтка-змагарка ўзнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені (21.02.1987 г.).*





Подтверждение

Я, Леошко Александр Никитьевич бывший командир партизанского отряда им. Котовского бригады им. Дзержинского Барановичского соединения в настоящее время проживаю в г. Барановичи ул. Чапаева д. 17 кв. 1 и работаю в в/части 36909 ст. товароведом.

Настоящим подтверждаю, что тов. Тарас Нина Михайловна, рождения 1916 г. уроженка д. Заполье Новогрудского района, в период немецкой оккупации территории Белоруссии с мая 1942 года по июль 1944 г. имела связь с партизанским отрядом им. Котовского и представляла командованию отряда необходимые сведения о противнике, а также распространяла среди населения сводки Совинформбюро и листовки представляемые ей командованием отряда.

В чем даю настоящее подтверждение.

Бывший командир п/отряда им. Котовского бригады им. Дзержинского (А. Леошко)

17 января 1972 г.

Подпись гр-на Леошко Александра Никитьевича заверяю:

Секретарь исполкома Барановичского городского Совета депутатов трудящихся (Н. Жилина)



Личный листок

по учету партизанских кадров

1. Фамилия, имя и отчество Тарас Нина Михайловна
2. Год и место рождения 1916 д. Заполье, Новогрудского района.
3. Национальность белоруска 4. Соцположение (до вступления в партизаны) домохозяйка
5. Время поступления в КПСС или ВЛКСМ, беспартийная
6. Образование: общее и военное окончила Виленскую белорусскую гимназию
7. Каким РВК и когда призван в Красную Армию не призывалась
8. Участие на фронтах (где и когда) не участвовала
9. Откуда, когда и с какой должности прибыл в партизанский отряд с города Лиды в мае месяце 1942 года, была домохозяйкой
10. Был ли в плену (где и когда) нет
11. В каких партизанских отрядах, подпольных организациях или группах состоял, занимаемая должность и район действия п/о им. Котовского бр. им. Дзержинского

1. с мая 1942 г. по июль 1944 г.

связная партизанского отряда (рядовой, ком. взвода и т. д.)

отряд им. Котовского бригады им. Дзержинского действовал в Любчанском Новогрудском р-не Барановичской области Лидском р-не Гродненской обл.

12. Ранения и контузии (где и когда) нет



13. Награды (ордена и медали) медаль За трудовое отличие
14. Семейное положение (состав и адрес семьи) мать Тарас А. С. д. Заполье, Новогрудского р-на

15 февраля 1972 года Нина Тарас (личная подпись)

15. Боевая характеристика Тарас Н. М. за время работы связной добросовестно выполняла поручения партизанского отряда. Представляла отряду необходимые сведения о расположении противника, распространяла среди населения сводки Совинформбюро и листовки передаваемые ей командованием партизанского отряда.

Командир партизанского отряда (бригады)

Комиссар партизанского отряда (бригады) (Ченцов)

Подписи т.т. Леошко Александра Никитьевича и Ченцова Никиты Ивановича заверяю:

Секретарь исполкома Барановичского городского Совета депутатов трудящихся (Н. Жилина)

г. Барановичи

Дакументы аб удзеле Ніны Тарас у партызанскім руху

Сайт «Партызаны Беларусі»



Паважаны тав. Лыньков! 1

Шчыра дзякую за пісьмо. Я не мела адвагі пісаць Вам, ці наогул у Саюз Пісьменнікаў, думаючы, што мяне адтуль даўно ўжо выкраслілі.

Вершамі не пахвалюся: у мяне іх мала. Але пры дапамозе Саюза Пісьменнікаў, думаю, мне ўдалося-б у гэтым годзе выдаць зборнічак. У бліжэйшым часе хачу апрацаваць усе свае вершы, якія „загінулі" у часе нямецкай акупацыі: частку з іх выслала ў выдавецтва на імя т. Клімовіча, астатнія прышлю пазней.

Што датычыць маіх далейшых планаў, то яны простыя, але трудныя ў выкананні. Пакуль хачу



заняцца працай толькі над вершамі, апрацаваць і упарадкаваць усю сваю старую з папярэдніх гадоў, а ў тым часе можна штось новае спісаць-б. Працуючы ў рэдакцыі газеты „Уперад" гэта з усім не магчыма. Бо я з аддзела маю на сумленні, што марную час, хацябы ў сапраўднасці працую. Я ўжо пастанавіла пераехаць у Мінск, але мяне туды не адпускаюць нават на пару дзён.

Паважаны тав. Лыньков, была-б Вам вельмі ўдзячна, калі-б Вы дапамаглі мне выйсці з гэтага палажэння.

Са шчырым прывітаннем
Ніна Тарас

Ліда, 20/III-45.

Ліст М.Ц.Лынькову ад Н.М.Тарас. 20.3.45.
Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва». Ф. 191. Воп. 1. Спр. 417. Арк. 1, 1зв.

*Пасля вайны Ніна Тарас пераехала ў Мінск.*
*У 1946 годзе выйшаў з друку яе другі зборнік «Суніцы».*

*У сталіцы Ніна Міхайлаўна працавала ў Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, у рэдакцыіі газеты “Піянер Беларусі”, друкавала зборнікі вершаў, пісала аповесці. Вучылася завочна ў Беларускім дзяржаўным унівэрсітэце, на Вышэйшых двухгадовых курсах ў Маскве.*



Фатаздымак у Каралішчавічах. Злева направа: Сяргей Грахоўскі, Еўдакія Лось, Ніна Тарас, Уладзімір Дадзіёмаў. 1960 г.

Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва». Ф. 204. Воп. 4. Спр. 333. Арк. 2

## АБ НАШЫХ ЗЕМЛЯКАХ

# ПАЭТЭСА НІНА ТАРАС

**(ДА 50-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)**

Беларуская паэтэса Ніна Міхайлаўна Тарас нарадзілася 15 мая ст. стылю, або 28 мая 1916 года ў вёсцы Заполле Навагрудскага раёна. Бацька паэтэсы Міхась меў толькі два гектары зямлі, а ў хаце, акрамя жонкі, было пяцёра дзяцей. Бацька Ніны наймаўся на работу да заможных сялян па цяслярнай і сталярнай справах: каму зруб паставіць, каму зробіць вокны, а каму і падлогу пасцеле. Нялёгка прыходзілася ў сям'і і старшай дачцы Ніне.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, Ніна знаходзіла час і на вучобу. З малых гадоў яна любіла паэзію. Часта яе можна было бачыць адну з кнігай у руках на беразе рэчкі, у садзе або ў агародзе. Пасля сканчэння пачатковай польскай школы дзяўчына паступіла ў беларускую гімназію ў Навагрудку. І там пад уплывам рэвалюцыйна настроенай моладзі і падпольшчыкаў-камсамольцаў складваецца светапогляд будучай паэтэсы. У гэтай жа гімназіі вучыўся некаторы час і вядомы паэт Валянцін Таўлай. Часта на школьных вечарах разам з вершамі М. Танка, Коласа і Купалы чыталіся вершы маладых паэтаў Таўлая і Тарас. Яе вершы гімназісты перапісвалі ад рукі і распаўсюджвалі сярод насельніцтва.

У вершах Ніны Тарас паказана цяжкая доля сялянства Заходняй Беларусі. Яны былі турботнымі і лірычнымі, выражалі пратэст супраць панскай няволі.

Не ўдалося Ніне скончыць Навагрудскую гімназію. Панскі ўрад правёў арышты сярод гімназістаў, а школу закрыў. Гэта была апошняя легальная пляцоўка беларускай культуры ў Заходняй Беларусі. Некаторым гімназістам удалося ўладкавацца на вучобу ў Віленскую гімназію. Сярод іх была і Ніна. Віленскую гімназію яна скончыла ў 1936 годзе. Тады ж у прагрэсіўных беларускіх выданнях з'явіліся і яе першыя творы.



Апрача апісання цяжкай долі працоўных Заходняй Беларусі, у вершах Ніны Тарас значнае месца займае тэма ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Савецкай дзяржаве (зборнік «На ўсход ідучы»). Калі здзейснілася запаветная мара беларусаў і яны ўз'ядналіся ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы, Ніна Тарас аддала натхненне песням аб новай долі вольнага народа, аб зменах у жыцці заходніх абласцей Беларусі ва ўмовах савецкага ладу. Многа яе вершаў прысвечана дружбе народаў і барацьбе за мір. Паказаны зверствы фашыстаў на нашай зямлі і гераічная барацьба народных мсціўцаў у час Вялікай Айчыннай вайны.

У 1957 годзе Н. Тарас закончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы пры Саюзе пісьменнікаў у Маскве. Яна з'яўляецца аўтарам паэтычных зборнікаў: «На ўсход ідучы», «Суніцы», «Вершы», «Кветка шчасця». У 1960 годзе ў Маскве выйшла кніга выбраных вершаў «Синие волны». Цяпер Ніна Тарас працуе над аповесцю «Бура».

Жыве наша паэтэса ў Мінску. Але не забывае яна і сваёй роднай вёскі Заполле. Тут жывуць і працуюць яе бацькі, брат Віктар і сястра Феня— настаўнікі Заполле-Ятраўскай сярэдняй школы. Суседзі і блізкія працуюць у калгасе «Заполле». Ніна сярод іх часты і жаданы госць.

Ніна Міхайлаўна ў росквіце сваіх творчых сіл. Пажадаем ёй новых поспехаў на літаратурнай ніве.

Навагрудская раённая газета «Новае жыццё» № 62. 26.05.1966




Зборнік вершаў «Пад белым яварам». 1966 г.




«Дарагім маім землякам піянерам і школьнікам Валеўскай сярэдняй школы. Мінск, 1967 г.»
Кніга з аўтографам Ніны Тарас.
Народны гісторыка-краязнаўчы музей Валеўскай сярэдняй школы Навагрудскага раёна

Ліст І.Шамякіна да П.Машэрава аб узнагароджанні Н.Тарас у сувязі з 60-годдзем. 1976 г.

Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва». Ф. 78. Воп. 1. Спр. 402. Арк. 29

I4 IУ 6

ПЕРШАМУ САКРАТАРУ ЦК КПБ
тав. МАШЭРАВУ П.М.

Паважаны Пётр Міронавіч!

I5 мая г.г. спаўняецца 60 гадоў беларускай пісьменніцы Тарас Ніне Міхайлаўне.

Ніна Тарас нарадзілася ў вёсцы Заполле Навагрудскага раёна ў сялянскай сям"і. Вучылася ў пачатковай школе ў роднай вёсцы, пазней — у Навагрудскай беларускай гімназіі. Пасля яе закрыцця польскімі ўладамі паступіла ў Віленскую беларускую гімназію, якую закончыла ў I936 годзе. Прымала ўдзел у рэвалюцыйным падпольным руху. Пасля ўз"яднання Беларусі працавала ў лідскай раённай газеце "Уперад", выбіралася дэпутатам Лідскага гарсавета У час Вялікай Айчыннай вайны Н.Тарас была сувязной партызанскага атрада імя Катоўскага брыгады імя Дзяржынскага, уваходзіла ў лідскую спецгрупу партызанскай брыгады імя С.М.Кірава. Пасля вайны аднавіла працу ў раённай газеце "Уперад", потым нейкі час працавала ў Дзяржаўным выдавецтве БССР, у рэдакцыі газеты "Піянер Беларусі". У I957 годзе скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве.

Друкавацца пачала з I936 года ў віленскіх перыядычных выданнях. Выйшлі з друку паэтычныя зборнікі, у тым ліку і для дзяцей: "На ўсход ідучы...", "Суніцы", "Вершы", "Казкі пра абавязкі", "Кветка шчасця", "Пад белым яварам", "Наш бор".

Просім разгледзець пытанне аб узнагароджанні Н.М.Тарас у сувязі з яе шасцідзесяцігоддзем.

З павагай

Першы намеснік старшыні
Праўлення СП БССР /І.ШАМЯКІН/




* * *

О як бы хацела ўсё тое,
Што я па зярнятку збірала,
Што самае ў сэрцы святое
Высаджвала
І гадавала,

Не раз палівала, расціла
Тайком ад варожай напасці,
Што ў марах трывожных насіла,—
Аддаць для людзей па шчасце.

Ды шчасце яшчэ далёка —
Ад слёз не абсохла планета...
А ў небе ўжо новы рокат —
І бомбы ляцяць над светам.

І бомбы ляцяць з напалмам,
Ляцяць на хаціны і пальмы —
Туды, дзе даліны ў кveцы,
Туды, дзе жанчыны і дзеці...

О песні мае,
На прыволле
Па свеце шырокім ляціце,
Павісніце хмаркай над полем,
Людзей ад бяды засланіце.

Не дайце ўзарвацца сэрцам,
Не дайце ўзарвацца планеце...
Хай сэрца для шчасця б'ецца,
Планета ж цвіце хай дзецям.



Верш з кнігі Н. Тарас «У тапаліную замець». Мінск: «Мастацкая літаратура», 1976 г.



Беларуская паэтэса
Канстанцыя Буйло

Ліст Ніны Тарас да Канстанцыі Буйло. 11.01.79.
Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва».
Ф. 263. Воп. 1. Спр. 101. Арк. 13



Дарагая, родная мая
Канстанцыя!

Сардэчна віншую цябе са слаўным юбілеем. Будзь здаровая і шчаслівая, наша добрая, прыгожая, скромная, абаяльная, любімая намі ўсімі пяснярка роднай беларускай зямлі, з якою так утульна жывецца пад светлым блакітным небам...

А я асабіста буду вечна ўдзячна табе, мая харошая, за тыя ўзнёслыя радкі тваёй паэзіі, якія ў змрочныя гады панскай Польшчы, бы вясеннія промні сонца, асвятлялі нашы хаты, саграваі нашы сэрцы, будзілі радасныя надзеі...

Абдымаю цябе, наша чыстая званкая крынічка, моцна моцна. Прыпадаю да яе пяшчотных хваляў вуснамі сваімі і душою сваёю.

Жыві для нас вечна!

Ніна Тарас

Мінск,
11/I-79 г.

*Акрамя ўжо згаданых Ніна Тарас з’яўляецца аўтарам зборнікаў “Вершы” (1952), “Кветка шчасця” (1958), “Праметэю прыйду пакланіцца” (1981), “Праз вятры-завеі” (1986), а таксама кніжак для дзяцей “Казкі пра абавязкі” (1955) і “Наш бор” (1968).*









ПРАМЕТЭЮ ПРЫЙДУ ПАКЛАНІЦЦА

Праметэю прыйду пакланіцца
За агонь той, што даў ён народам,
Каб ярчэй з кожным днём, кожным годам
Азараліся нашы святліцы;

За агонь той, што ўдарыў з «Аўроры»,
Кайданы і аковы расплавіў,
Зрух адсталай Расіі праславіў,—
Быццам з месца скрануў ён горы;

За агонь той, што ў сэрцах віхрыцца,
Што на дружбу, на подзвіг натхняе
І ад бураў вайны засланяе,—
Праметэю прыйду пакланіцца.

*1974*




*«Ва ўсёй лірыцы Ніны Тарас ёсць дыханне шырокага жыцця, спазнанага чалавекам і перажытага, ёсць радасць і боль чалавека, якія, прайшоўшы праз яго сэрца, сталі песняй. Няхай паэзія Н.Тарас нешматгранная, тым не менш гэта арыгінальная з'ява, асобны эмацыянальны свет, святло, свячэнне…»*

*А.Лойка*

Кніга Н.Тарас «Праз вятры-завеі».
Мінск: «Мастацкая літаратура», 1986 г.



* * *

Заўжды мы марым аб нечым узнёслым,
Нас вабяць дарогі, за далямі — далі:
То сняцца нам стэпы у ранку росным,
То клічуць марскія бурныя хвалі.

Нам хочацца болей шляхоў нязнаных,
Нязведаных нетраў, нябачных прастораў:
То вабіць нас неба, то шыр акіяна,
То ўдалеч ляцім, то ўзнімаемся ўгору...

Але як мы толькі раптам адчуем,
Што наша Радзіма ад нас — не блізка,—
Успомнім дарогу адзіную тую,
Якая вяла нас у свет ад калыскі.

*1962 г.*



# *Вершы, прысвечаныя Навагрудчыне*



НА СВІЦЯЗІ

*Адаму Міцкевічу*

*I*

Дубы спляліся і старыя клёны,
Спляліся сосны ў векавечны бор.
І дрэмле Свіцязь у вянку зялёным —
Ці сонца ззянне, ці мігценне зор.

Калышуцца сівыя верхавіны,
Праносяцца над хвалямі гады...
А я задумна ціхаю хвілінай
Хаджу, шукаю песняра сляды.

А я гляджу, заслухаўшыся дбайна,
Ды адгадаць ніяк я не магу,
Сасне каторай давяраў ён тайны,
З каторым вязам падзяляў тугу.

Мо тут русалку заўважаў у тоні,
Мо з рыбкаю чароўнай гаварыў?
А бор шумеў магутны, як сягоння,
І дзесь сава гукала у бары.

Кіпела Свіцязь навальнічнай пенай,
І казкі зіхацелі з-пад вясла...
Якая хваля плёскатам таемным
Да нас яго балады данясла?

102



Калышуцца, шапочуць верхавіны,
Праносяцца над хвалямі гады...
А я хаджу ля возера няспынна
І ўсё шукаю песняра сляды.

*II*

Расказваюць, сядзеў ён тут калісьці
На беразе ўсю ноч аж да зары.
Вясна грымела ў салаўіным свісце,
Пралескі дацвіталі у бары.

На небасхіле уставалі хмары,
Мяняўся колер чыстае вады.
А ён тужыў, што не збыліся мары,
Надзеі абманулі, як заўжды.

Дарэмна ён вярнуўся з падарожжа
У край юнацтва яснага свайго:
Адзіная,
што ўсіх яму даражэй,
Не вернецца ніколі да яго!..

Ля ног жывыя хвалі трапяталі,
Пад ветрыкам хісталася лаза.
Пясняр тужыў...
І капнула на хвалю
Яго сляза.

103





Возера Свіцязь



З НАВАГРУДСКАЙ ГАРЫ

*Адаму Міцкевічу*

Выйдзі і глянь з Навагрудскай гары —
Колькі дарог пралягло удалеч!
Меркнуць адны у туманным бары,
Другія імчацца за ўзгоркаў хвалі.

Тая вядзе ў Налібоцкі гушчар,
Гэтая нікне ў зялёнай Рутцы...
Якою ж дарогай вандроўнік-пясняр
Пайшоў, каб ніколі назад не вярнуцца?

Яму пазіралі сасонкі услед,
Ківалі галовамі сумна таполі,
І слалі яму на чужыну прывет
Кожная траўка, былінка ў полі.

Тужылі бярозкі пяшчотна па ім,
Дубы галасілі ў зімовую замець,
І плакала скрытна каліна ў гаі
У дождж-непагоду жывымі слязамі.

Дрыжалі асіны кожным лістком,
Над Свіцяззю вербы рукі ламалі...
А толькі ўсе тыя маўчалі маўчком,
Якія паэта з радзімы прагналі.

*1963*

101

Беларусь мая, бярозка белая,
Ад марозу ўся заінелая,
Зімы лютыя ўспамінаючы,
Рада сонейку ты вяснянаму,
Косы доўгія расплятаючы,
Рада ветрыку закаханаму,
Рада выраю ты птушынаму,
Спеву дзіўнаму салаўінаму,—
Беларусь мая, бярозка майская,
Абагрэтая сонца ласкаю.

*1966*



*Выстава прысвечана Году беларускай жанчыны*

Выкарыстаны дакументы і фотаздымкі ўстановы «Занальны дзяржаўны архіў у г. Навагрудку», установы «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва», установы культуры «Лідскі гісторыка-мастацкі музей», ДУК «Навагрудская раённая бібліятэка», Народнага гісторыка-краязнаўчага музея Валеўскай сярэдняй школы, інфармацыя з адкрытых Інтэрнэт-крыніц

Навагрудак, 2026